# Што такое адзінства

Сергіеня Екацярына, вучаніца 8 класа
дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 1 г. Слуцка”

Беларусы адзіныя ў імкненні
жыць на роднай зямлі сваім
розумам і працай.
Адзінства – галоўная ўмова развіцця
нацыі.

А.Р. Лукашэнка

Адзінства… Сям’я… Радзіма… Беларусь… Гісторыя… Подзвіг народа...

Тэма народнага адзінства натхніла мяне на творчасць. У мяне ўзнікла вялікае жаданне падзяліцца сваімі думкамі.

Што такое адзінства? Для мяне адзінства – гэта слова, якое я часта чула ў школе, дома, па тэлебачанні, але не заўсёды задумвалася аб яго сапраўдным значэнні. Я наведваю музычны гурток і ўяўляю сабе, што адзінства нагадвае аркестр. У ім кожны музыкант іграе сваю партыю, але толькі разам усе яны ствараюць выдатную мелодыю. Кожны інструмент важны, кожны голас патрэбны, каб стварыць адзінае цэлае. Таксама і ў жыцці. Мы ўсе розныя, у кожнага свой талент, свой характар, свае мары. Але толькі аб'яднаўшы свае намаганні, мы можам дасягнуць чагосьці большага, чым маглі б паасобку. Адзінства – гэта не проста сяброўства або агульныя інтарэсы. Гэта разуменне таго, што мы ўсе звязаны паміж сабой, што нашы дзеянні ўплываюць на іншых. Гэта гатоўнасць дапамагаць, падтрымліваць адзін аднаго ў цяжкую хвіліну.

Адзінства – гэта мая сям’я. Матуля Ірына працуе педагогам сацыяльным у гімназіі, тата Сяргей - настаўнікам фізічнай культуры і здароўя ў школе, сястрычка Ксенія - педагогам-псіхолагам дзіцячага сада, а я з’яўляюся вучаніцай 8 класа гімназіі №1 горада Слуцка. Мы такія розныя, але мы жывём разам, мы родныя! У коле сям'і мы вучымся падтрымліваць і натхняць адзін аднаго, дапамагаць адзін аднаму. Мне вельмі падабаюцца сумесныя вечары, праведзеныя за чытаннем кніг, праглядам і абмеркаваннем кінастужак. Мы любім гульні, экскурсіі па роднай Беларусі, паходы, у якіх ўдзельнічаем разам. Я вельмі люблю сваю сям’ю! Я лічу, што патрыётамі не нараджаюцца, а імі становяцца ў працэсе выхавання ў сям’і і ў школе.

Мая Случчына – месца, дзе я нарадзілася. Гэта наступны крок да ўсведамлення адзінства. Горад Слуцк, які знаходзіцца ў Мінскай вобласці – вельмі прыгожае месца, дзе жывуць шчырыя і добразычлівыя людзі. Мы вучымся, працуем, радуемся і разам пераадольваем жыццёвыя нягоды. Нас аб'ядноўвае зямля, на якой мы нарадзіліся і расцём. Менавіта тут, на роднай зямлі, фарміруюцца нашы карані, наша ідэнтычнасць. Мы вучымся любіць сваю зямлю, яе гісторыю, яе людзей, і гэта пачуццё любові становіцца нашай рухаючай сілай. На мой погляд, адзінства – гэта не проста слова, гэта магутная сіла, якая аб'ядноўвае людзей, ствараючы непахісную апору, якая, як скала, стаіць пасярод бушуючага мора. Для мяне адзінства – гэта не проста

абстрактнае паняцце, а глыбокае пачуццё, якое звязвае мяне з маёй радзімай – роднай Беларуссю.

Беларусь – мая краіна, мая вялікая сям'я, мая зямля, дзе я нарадзілася, дзе захоўваюцца мае карані. Яе палі, лясы, рэкі – гэта мая гісторыя, мае ўспаміны, мая душа. Я адчуваю глыбокую сувязь з гэтай зямлёй, з яе народам, з яго культурай, з яго традыцыямі. Я лічу, што адзінства робіць нас моцнымі. Калі мы адзіныя, мы здольныя пераадолець любыя цяжкасці, абараніць сваю Радзіму, стварыць лепшую будучыню для сябе і нашых будучых пакаленняў.

Адзінства – гэта не проста слова, гэта жыццёвы шлях, які мы павінны прайсці разам, трымаючыся за рукі, як адна сям'я. Толькі ў адзінстве мы зможам стварыць светлую будучыню для нашай Радзімы, для Беларусі. Я люблю сваю Радзіму, і ганаруся тым, што я частка гэтага адзінага цэлага. Я хачу ўнесці свой уклад у росквіт Беларусі, у захаванне яе культурнай спадчыны. У адзінстве народа – сіла краіны!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка заявіў на ўрачыстым мерапрыемстве да Дня народнага адзінства: «Беларусы адзіныя ў імкненні жыць на роднай зямлі сваім розумам і працай. Адзінства – галоўная ўмова развіцця нацыі». Я поўнасцю згаджаюся з гэтымі словамі і хачу нагадаць, што 85 гадоў таму менавіта з вызваленчага паходу Чырвонай Арміі пачалося адраджэнне страчанай унутранай цэласнасці Айчыны. Цяжка ўявіць, колькі выпрабаванняў перажыў беларускі народ, ствараючы ўнікальную прастору для жыцця і пракладваючы дарогу да шчасця ў бесперапыннай барацьбе за волю, лепшую долю і родны парог. Кожны з этапаў гэтага нялёгкага шляху беларусы годна пераадольвалі, абапіраючыся на любоў да міру і праўды, справядлівасць і патрыятызм, узаемную павагу і добрасуседства.

Як жа хочацца, каб кожны з нас адчуваў сябе беларусам-патрыётам! А магчымасць жыць і самарэалізоўвацца ў нашай краіне ў поўнай меры з’явілася менавіта ў выніку падзей, якія адбыліся 17 верасня 1939 года. У гэты дзень мы атрымалі свой нацыянальны дом і дабрабыт.

Адзінства для Беларусі – гэта сіла, якая дапамагае нам захоўваць нашы традыцыі, памятаць пра герояў і ганарыцца дасягненнямі. Свята, якое мы адзначаем 17 верасня, сімвалізуе адзінства народа. Калі мы разам, мы можам справіцца з любымі цяжкасцямі і пабудаваць светлую будучыню для нашай краіны.

Мне запалі ў душу словы Янкі Сіпакова: «Любая Радзіма! Вельмі шаноўная мая Беларусь! Маці наша родная — усіх нас разам і кожнага паасобку! Нізка схіляюся перад табою ў пашане ўжо толькі за тое, што ты заўсёды была, заўсёды ёсць і заўсёды будзеш. I калі думаеш пра цябе, і калі часам забываешся — ты спрадвеку з намі!»

Я заўсёды буду патрыётам сваёй зямлі, буду памятаць тых людзей, з якімі жыла, вучылася, якія даюць мне пуцёўку ў самастойнае сталае жыццё. Я буду сапраўднай грамадзянкай Рэспублікі Беларусь і гатова адстойваць інтарэсы сваёй краіны. Нават у складаны час я буду кіравацца яе інтарэсамі, бо радзіму, як і маці, не выбіраюць. Яна даецца нам з нараджэннем і назаўсёды!